# Нашы юбіляры

Сёння назва нашай рубрыкі цалкам адпавядае яе зместу: юбіляраў у нас ажно чатыры. Усім ім споўнілася па 70 гадоў, усе яны вядомыя беларускія навукоўцы, усе ў свой час былі членамі рэдкалегіі нашага часопіса, а М. В. Навучыцель і цяпер уваходзіць у склад гэтага грамадскага фарміравання.

Рэдакцыя часопіса шчыра віншуе юбіляраў і жадае ім шчасця, здароўя, творчых поспехаў.

## АНДРЭЙ ВАСІЛЬЕВІЧ ДУЛАЎ



Доктар навук, прафесар кафедры крыміналістыкі юрыдычнага факультэта Андрэй Васільевіч Дулаў нарадзіўся ў Ленінградзе. З пятнаццаці гадоў пачаў працаваць электраманцёрам на заводзе. Дабравольцам народнага апалчэння ён абараняў родны горад у гады Вялікай Айчыннай вайны. Пасля атрымання цяжкага ранення пачаў працаваць следчым, затым старшым следчым пракуратуры, завочна вучыўся ў Ленінградскім юрыдычным інстытуце, які скончыў у 1950 г. У 1952—1955 гг. Андрэй Васільевіч — аспірант гэтага інстытута. У 1955 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю. Працаваў загадчыкам лабараторыі, выкладчыкам кафедры крыміналістыкі Ленінградскага універсітэта.

У 1958 г. А. В. Дулаў па конкурсу заняў пасаду дацэнта ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, дзе і працуе да гэтага часу. У 1964 г. абараніў доктарскую дысертацыю, у 1966 — атрымаў званне прафесара. З 1972 па 1990 г. загадваў створанай па яго ініцыятыве кафедрай крыміналістыкі.

За гады працы ў БДУ стаў вядомым вучоным у краіне і за яе межамі. Ён падрыхтаваў 32 кандыдаты юрыдычных навук. Тры з іх ужо абаранілі доктарскія дысертацыі. Прафесар А. В. Дулаў вызначаецца разнастайнасцю навуковых інтарэсаў. Істотны ўклад унесены ім ў развіццё тэорыі судовай экспертызы. Па гэтай праблеме ім апублікаваны тры манаграфіі. Новыя навуковыя напрамкі даследаваны А. В. Дулавым і ў крыміналістыцы, што адлюстравана ў манаграфіях «Тактыка следчых дзеянняў» (1973), «Тактычныя аперацыі пры расследаванні злачынстваў» (1979), «Выкарыстанне карэляцыйных залежнасцей пры расследаванні крадзяжоў» (1983), «Расследаванне злачынстваў службовых асоб» (1985).

Значную ўвагу прафесар А. В. Дулаў удзяляе распрацоўцы праблем прафілактыкі злачынстваў, юрыдычнай асветы, маральна-прававому выхаванню.

Андрэй Васільевіч стварыў і чытаў упершыню ў былым СССР два новых вучэбных курсы для юрыстаў — «Юрыдычная этыка» і «Судовая псіхалогія». Па гэтых дысцыплінах ім апублікаваны дзве манаграфіі, вучэбны дапаможнік і шэраг артыкулаў.

Баявыя і працоўныя заслугі А. В. Дулава адзначаны двума ордэнамі, чатырнаццацю медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і рэктарата БДУ.

Калектыў кафедры крыміналістыкі, калегі і вучні, студэнты юрыдычнага факультэта БДУ шчыра віншуюць Андрэя Васільевіча з юбілеем і жадаюць яму моцнага здароўя, шчасця, новых творчых поспехаў.